Источник: "Рэспубліка" - 2015-01-23

# АДНЫМ СКАЗАМ

- Каля 600 адзінак спецтэхнікі і 800 прыбіральшчыкаў задзейнічана ва ўборцы снегу ў Мінску.
- Беларуская дэлегацыя пryме ўдзел у мерапрыемствах з нагоды 70-годдзя вызвалення канцлагера «Асвенцым» у Польшчы.
- Міністр замежных спраў Уладзімір Макей і дзяржаўны сакратар МЗС Латвіі Андрэйс Пілдэговічс абмеркавалі стан і перспектывы адносін па лініі Беларусь — ЕС.
- Наша краіна на сесіі ААН заявіла аб неабходнасці падтрымліваць сямейныя каштоўнасці.
- Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях плануе завяршыць 22 інавацыйныя праекты ў гэтым годзе.
- Беларусь падпісала рамачнае пагадненне з Паўночнай экалагічнай фінансавай карпарацыяй.
- Нацыянальная акадэмія навук сфарміруе топ-100 інавацыйных распрацовак для прамысловасці.
- Інвестыцыйны патэнцыял краіны прэзентавалі ў французскіх гарадах Ліль і Туркуэн.
- Уладальнікі беларускіх дыпламатычных і службовых пашпартоў з 7 лютага змогуць наведваць Камбоджу без віз.
- Адвакатура краіны ў Год моладзі плануе абнаўляць кадры перш за ўсё за кошт выпускнікоў ВНУ.

"Рэспубліка". Адным сказам